Цэна асобнага нумэру 5 кап.

# НАША НІВА

**Выходзіць што тыдзень**

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: Вільня, Завальная вуліца, д. № 7.

Цэна з перэсылкай і дастаўкай на 1 г. — 2 р. 50 к., на 6 мес. — 1 р. 25 к. на 3 м. — 65 к., на 1 мес. — 25 к. За граніцай: на 1 г. — 4 р., на 6 мес. — 2 р. 3 мес. — 1 р. Перамена адрэсу — 20 коп.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі. Рукапісы і карэспандэнціі, прысланые у рэдакцыю, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго, хто яе прысылае. Можна такжэ надпісаць прозвішчэ разам з фаміліей, хто не захочэ, каб была надрукавана праўдзівая фамілія. Адрэс і фамілія толькі для ведама рэдакцыі. Рукапісы аўторам не вертаюцца назад.

Год VIII. 5 Ліпня 1913 г. №. 26-27.

## Чаму гэтак?

Заседаньня Думы скончыліся. Дэпутаты раз'ехаліся на летні адпачынак—да восені, да 15 акцябра.

Што-ж зрабіла Чацьвёртая Дума за першы год жыцьця? На якую дарогу ступіла яна і куды кіруецца?

Для народу працоўнаго, для тых мільёноў селян і рабочых, што ўсё жыцьцё сваё гарапашнае робяць дзеля карысьці чужых людзей, — для іх Дума бадай што нічога не зрабіла. Не дала тэй волі, аб якой пісалося восем гадоў таму назад у Маніфэсьці 17 акцября (1905 году); не дала ні долі, ні хлеба тым, хто ад яе гэтак многа чэкаў...

Чацьвёртая Дума ступіла і ідзе па гэткай самой дарозі, па якой ішла Трэйцяя. А як у гэнай загадчыкамі былі правые і націоналісты, каторые рупіліся найбольш аб карысць заможных станоў — асабліва расейскіх, дык і цяпер Дума кіруецца да тае ж мэты.

Агулам кажучы, Дума паводлуг сваей думкі нічога не стварыла *новаго*. Яна адно толькі разглядала казённые праекты законоў, ды. болей ці меней змяніўшы, прыймала іх, або часам зусім аткідала.

Калі-ж падыймалася справа аб палепшэньні жыцьця народу, аб волі усім грамадзянам дзержавы,— тагды, як адзін чэлавек, узнімаліся правые, націоналісты ды іх хаўруснікі акцябрысты і супольнымі сіламі аткідалі ўсё добрае, карыснае для народу. Для націоналістоў і правых карысна *панаваць* як над сваімі, расейскімі селянамі і рабочымі, так і над уселякімі «іпородцамі». І Трэйцяя, а за ёй Чацьвёртая Дума ахвотне праводзяць кожын закон, што урэзывае правы «інородцоў».

Калі Дума вядзе гэткую палітыку, дык гэта затым, што правы ня толькі „інородцоў“, але і расейскаго народу пры выбары дэпутатоў дужа урэзаны. Там, дзе народ сьвятлейшы, селяне зусім ня могуць папасьці ў дэпутаты: ўся сіла дадзена паном (скрозь на «акраінах»: у Польшчы, ў латышскім краю, ў віленшчыне і т. д.), і калі яны пускаюць каго-небудзь з селян у Думу, дык ужо такога, каторы будзе ва ўсіх справах кіравацца ў той бок, як яму загадаюць.

Гэтак і з нашай старонкі паехалі ў Пецярбург людзі, ў каторых сэрцэ бьецца ня тутака—ня ў роднай зямлі, а ў Маскве ці Варшаве. І ня дзіва, што аб Беларусі і Беларусах не было чутно нічога. Казалі толькі нашы «дабрадзеі», каторые з расейцоў (Замысловскіе, Юзьвюкі ды іншые), бытцым беларусы - гэта чыстакроўные расейцы, а каторые с палякоў—што ўсе беларусы каталікі ўсё роўна, як і палякі...

Украінцы даўно маюць сваіх дэпутатоў, каторые цьверда стаяць за свой народ, за яго правы, за родную мову. Гэтак сама і Літвіны. Толькі мы, беларусы, не патрапілі выбраць ніводнаго шчыраго сына свайго народу і сваей Бацькоўшчыны. Не аб нас, не аб роднай зямлі думаюць дэпутаты з нашаго краю: іх думка далека ад беларускаго народу, яна кіруецца адно толькі да іх асабістай карысьці...

Вось чаму аб нас або зусім маўчалі, або, калі ўспаміналі, дык успаміналі нашы ворагі, дамагаючыся, каб беларускі народ звялі зусім да званьньня...

*Б. С.*

———

## Сплачывайця доўг.

Ехаў я чыгункай. Сустрэціўся з нейкім пажылым ягомасьцем; разгаварыліся. Сам ён родам с тульскай губэрні, жыве у Пецярбурзе, а кожнае лета праводзіць у Беларусі. Бываў ён у Крыме на Каўказе, знае заграніцу.

— Толькі нідзе такой харошай, такой ціхай прыроды ні бачыў я — казаў ягомасць. — Ваш край гэта дзіўная казка, дзіўная краса крыецца у яго пагурках, гаях, лугах і рэках. Такое тут усё у вас спакойнае, ціхае, задумчывае, такое паэтычнае, такое ўсё, як французы кажуць «bon ton», што я кожнае лета цягнуся, каб дыхнуць вашым паветрэм, пацешыць вока вашымі відамі.

Слухаў я гэтых слоў чужынцастарца, бывальца па сьвеці і ў душы мне зрабілося сумна, сумна... Спомніліся мне вершы нашых беларускіх паэтоў, которые заместа ўслаўляць нашу, папраўдзі бязмерна харошую прыроду, абезслаўлялі яе. Адзін з іх кажэ:

„Куры, сьвіньні, гною кучы
Напаўняюць кожны кут.
Вокны затканы анучай
Так і кажуць: „ўсюды бруд!“.

Другі падпевае:

„Край наш бедны, край наш родны,
Грязь, балота ды пясок!“

Ешчэ іншы плачэ:

„Не вясёлая старонка
Наша Беларусь,
Людзі: Янка ды Сымонка,
Птушкі: дрозды, гусь“...

У канцы нехта чуткі з рослачч у крычыць:

„Край ты мой родны,
Як выкляты Богам“.

Супакойцеся ягомасьці, край наш не такі страшны, не такі сумны, брудны і бедны. Жывой красы ў прыродзе нашаго краю, ў людзях многа, хіба толькі тое сумна, што мы яе падмеціць, падглядзіць ня ўмеем.

Я разумею ешчэ (ды і то з нацяжкай) енкі і плачы тых нашых бэлетрыстоў і паэтоў каторые (цыбуляй хіба крыху паціраючы вочы) плачуць над доляй селяніна, можэ хочучы выказаць ня тое, што Янка, ці Апанас сядзіць поўпьяны на печы і у яго гаспадарка няспорыцца «шнур травой зарастае», у вокнах «анучы» і «ня мецена хата», а тое, што народ, увесь народ-нація жыве у цяжкім безпраўным палажэньні, што душа нашаго народу скручэна ланцугамі і ў здзекў і ў пагардзе, як прыгонніца, як раб канае доўгіе векі і ні сканаць, ні жыць ня можэ. То гэтым «паэтам» можна даравaць іхніе нескладные плачы. Але, дзякаваць Богу, ёсць-жэ у нас ужо і імёны, каторые

## ВЫСТАГНАУСЯ.

### Родные зьявы.

I.

Іван Кіслы гараваў ўсё сваё жыцьцё. Усё горэ было ў тым, што у гэтаго гора было ешчэ сваё горэ. заўсёды выпадало так, што беднаму Івану ніколі не удавалося выплакацца, выгаравацца, выскардзіцца і гэтым самым выліць з душы ўсю гаркату, ўсю боль пахілаго жыцьця. І ўсё складалося, як сумыслу, як бы нейчая злая воля неа дступна цягнулася за Іванам і не давала яму здарэньня аблегчыць яго душу. Цягнулася яна з даўных даўных часоў, с тых часоў, калі Івана ешчэ трудна было адлічыць ад Мар'і, на чэй сказаўшы, калі Іван ешчэ пехатой хадзіў пад стол. Разравецца, бывала, Іван... ды каб жэ разроўся, як людзі: толькі скрывіць губы, глядзіш—ужо маці зьнімае хвартух і мабілізуе паскі на Іванаву сьпіну «ня сьмей плакаць». Дзе тая праўда на сьвеці? Чаму Антось як пачне плакаць, то кінецца на сьпіну аб землю і барабаніць нагамі так, што яму можэ пазайздросціць первейшы барабаншчык? Вазьмі-ж ты. Выйдзе Іван на вуліцу, завядзецца с кім біцца—што-ж гэта за чэлавек, калі ні разу ні пабіўся?—паб'юць, пакрыўдзяць Івана. Што-ж бы вы, добрые людзі, рабілі, каб вы самі былі Іванамі? Вы-б заплакалі, і ўсякі-б заплакаў. А чаму не паплакаць Івану? Але-ж ніхай папрабуе заплакаць: засьмяюць, заплююць ды ў прыдачу горш наштурхаюць.

Раз Іван, моцна пакрыўджэны, адважыўся зайці ў кусты на берэг рэчкі. Прышоў Іван, азірнуўся, сеў на беражок, прыслухаўся. Тут, думаў ён, ніхто яму не пашкодзіць адплакацца за ўсё. Кругом было так сумна, так ціха. Здавалося, ўсё журылося і настроілося слухаць плач Івана. І нешта ў сярэдзіні, каля самаго сэрца, так завіло, так сціснула, што Іван раптам нагнуў галаву і мімавольна падняў калошы портачэк: яму здавалося, што у яго так многа вы- цячэ сьлёз, што вада ў берагах ня ўтоўпіцца. І толькі Іван завёў: „А-о-о-а—гы!“ Як с таго берэга паказалася с кустоў галава рыбака Сёмкі.

— Гэта ты прышоў, пужаць мне рыбу, злодзей ты?! Я табе паскавычу.

Так і засталіся нявыплаканые сьлёзы.

II.

Іван асіроцеў. Астаўся ён адзін на сьвеці, бы тая калатоўка. Быў ён на плытах і ні бачыў, як хавалі бацькоў, так што і тут Івану не удалося паплакаць, як людзі. Сёстры яго павыходзілі замуж, адзін брат выбраўся ў Амэрыку, другі паехаў у сьвет шукаць шчасьця і долі. І Іван астаўся адзін гаспадарыць. Ад бацькоў засталася яму хатка, сякая-такая будоўля, надоба, худоба і паўчверці зямлі. Была у Івана на прымеці і дзеўчына. Праз колькі месяцоў посьле сьмерці бацькоў ён зрабіў заручыны, а на Сёмуху было назначэно вяселле. За тыдзень перад Сёмухай Іван занядужэў. Доўга ён не паддаваўся. перэмагаўся, і ўсё-ж такі мусіў, бедны, здацца. У сераду перад Ушэсьцем, так пад вечэр, Іван злёг. Сьвяжыць Іван, а работа ўся стаіць, рабіць некаму, хата непадмецена, ўсюды непарадак. А на што ён, парадак гэты? думае Іван, ўсё роўна ён памрэ; знайдуцца добрые людзі і пахаваюць яго. Івану стала горка, як ніколі. Усё жыцьцё, шэрае, невясёлае жыцьцё, прайшло ешчэ раз прэд яго вочыма. Што-ж? ён памрэ. Яго закапаюць, і згніе ён, забыты скора навекі, і нічые вочы не затуманяцца слязьмі, як яго будуць несьці на могілкі. І гэта называецца жыцьцё, гэта яго век!.. Адна толькі сьветлая мінуціна мігалася яму, як адзінокая зорачка ў безрадасную восень: цяпер яму ніхто не пашкодзіць ўсім нутром, ўсею сілаю змучэнай душы атдацца смутку і жалю; хоць цяпер адплачэ ён ўсё горэ жыцьця, адстогне ўсю боль: ласьне чэлавек ні мае права хоць на адну мінуту, сьветлую мінуту, ў жудаснай імгле цёмнаго жыцьця?

Іван папраўіўся на пасцелі, зьмяніў палажэньне свайго цела і абвёў поглядам хату. І толькі што ён прыгатаваўся застагнаць, як на парозі паказалася фігура яго маладой. „І хто яе прасіў сюды? Чаго яна тут?“ падумаў Іван нахмурыўся.

— Галубок ты мой! што ты выдумаў хварэць?—жаласьліва спытала яго Магда.

— Ня добра мне, Магда. Мусіць і я пайду за бацькамі —сказаў Іван. Яму самому так горка стала ад сваіх гэтых слоў, што сьлёзы гатовы былі самі паліцца з ачэй.

— Ну, што ты выдумляеш? папраўішся Іванка,—і Магда прылажыла руку да лба Івана. Ешчэ большы жаль падшыб Івана. Хіба ўзяць ды заплакаць? зараўці на ўсю хату? Не! падумае, што ён - нюня, плаксівая баба; ешчэ і замуж не захочэ пайці. А боль так і ходзіць па ўсім яго целі, і яму, Івану, так хочэцца застагнаць. «Ці застагну ці не?» думае Іван. «Ой, скарэй бы яна йшла да дому!».

— Мне, Магдачка, ні так ужо і кепска, пачаў разважаць Іван Магду: — паляжу трохі і ўстану.

— Вот маладзец! — сказала Магда і нагнулася, каб пацалаваць хвораго. Дрож прабегла па целу Івана, яму стала надта прыятна. Ды Іван ахамянуўся: гэтак і ахвота пройдзе стагнаць і атдацца смутку.

— Можэ б табе, Івана, спарыць гарнушачак малака?

Іван заматаў галавою і павярнуўся на другі бок.

Магда колькі мінуцін пасядзела маўчком, як бы раздумываючы над тым, узлавацца ці не. На ўсякі выпадак яна надзьмула губкі і насупіла крыху бровы. Іван незаметна павярнуў галаву і зірнуў на яе адным вокам; не—не выпадае так рабіць. Ні адварочываючыся, Іван падняў руку і палажыў на плячо Магдзі. Гэтаго было даволі, каб Магда змякчэла.

— Паляжы, саколік, а я прыбяру крыху ў хаці, — і, ўзяўшы венік, яна стала падметаць хату, рабіць парадак, стаўляючы кожную рэч на сваё мейсца, а бедны Іван увесь яж кіпеў. Яму раптам зрабілося так ня добра, так заламало яму косьці, як бы хто цісьнуў яго апцугамі, аж ён скрыгікаў зубамі, каб стрымаць стагнаценьне, падкорчваў і выпростваў ногі, варушыўся і пакутаваў, як пасолены мянёк. А

маюць шырокую славу ня толькі у нашай безграматнай і безінтэлігенцкай бацькоўшчыне, а і далёка па за межамі яе. Ад гэтых апошніх, мы, чытаючае і думаючае беларускае грамадзянства ў праве вымагаць чагось для сваей душы, мерыць іхню творчасць меркай эўропэйскай, якую прыкладаюць усе народы на сьвеці да творчасьці сваіх прарокоў. Так,—прарокоў,—бо паэта павінен быць вучыцелем і прарокам сваго народу; павін быць судзьдзёй і цьветам душы яго, павінен выяўляць красу свайго народу і краю. Можэ скажуць мне, што апрача гною, пяску, ануч і драздоў у нас німа нічога годнаго увагі. Даруйце ягомасці—парнасьнікі, але кожны грамадзянін мае права сказаць:—я беларус, я часць народу—і карыстаючыся гэтым правам, я ніжэй падпісаны, прылюдна на ўвесь край крычу: Апрача драздоў, ануч, гною і пракляцьця у маей душэ ёсць ешчэ шмат красы, перэд маімі вачамі скрозь краса, жыцьцё, сонцэ, песьні і бязмернае багацьце відоў. Я хачу мець усё гэтаператворэнае ў спэктры колектыўнай нашай душы—ў словах нашых паэтоу—прарокоў. Мяне цікавіць ня толькі тое, што Янка сядзіць на вузкім шнурочку зямлі, але больш таго, што гэты Янка чуе ў той момэнт калі ён поўнымі грудзямі хапае пах чорнай, парэзанай плугам на скібы зямлі, як яго лянівы мозг варушыцца калі сахой разрэзае прадзедоўскі курган, што кажэ душа прадзедоў як іхніе косьці збіраюць праўнукі каб прадаць у фабрыку супэрфосфату?

Маё штодзенное жыцьцё шэрае, цяжкае і я хачу з вашых твороў, навучыцца бачыць каля сябе красу, каторую, я чую што яна ёсць, але мая душа не так чутка, каб уловіць яе.

Я прывык глядзець на паэта, як на памазанніка Божаго, як на прарока і дзеля гэтаго рука мая ніколі не памкнулася узяцца за пяро, каб накідаць вершы, бо я ў душы сваей чуюся нягодным гэтаго высокаго імені. Але вы, каторые, пачувацеся на сілах даць красу, даць мысль, паднімаць і вясьці душы, чаму не выпаўняеце свайго пасланніцтва, чаму маўчыцё, калі забіваюць у душах—незапісаных картах, красу, чаму ня вучыце нас любіць і разумець гоман бору, плеск вады у сонцы, задуму змеркоу яснату усходоў,—чаму не распаляеця душ нашых пажарам любові, ня сыпеця чырвонцоў ў жар гэты?

Плакаць і сыпаць славамі сцёртымі, як дробная медзяная манэта, як бачыце і я умею, і гэтаго з мяне годзі але за вамі, калі вы не апраўдаеця паложэных на вас надзей, народ будзе лічыць доўг і доўг гэты будзе чысьліцца за вамі да веку.

*Юры Верэшчака.*

---

## „Прыяцелі“.

Ужо чаго-чаго можэ нам Беларусам Бог паскупіў але толькі не „прыяцелёў“. Куды не памкніся, дзе не краніся, безпрэменна на „прыяцеля“ наткнешся. І як толькі наткнешся, то й пайшлі рымзы над нашай нешчасьлівай доляй — а у вас мова цяжкая, — а у вас, бедненькіх сьвядомасьці німа,—а вы выміраючы народ і ядыны ратунак прыняць вам вышэйшу культуру...—і пайшлі і пайшлі. Нідаўна мне адзін панок, сівенькі, старэнькі, быўшы дэпутат каторайсь там Думы, даводзіў, што каталікоў беларусоў і ў сьвеці ніколі не бывала ды беларусы каталікі гэта нават і не тутэйшые людзі, а ўсё „с кароны“ і так гэта усё чынна, ладна і складна выходзіло, як два а два—дзевяць, што беларусоў каталікоў німа. І каб я сябе не ушчыпнуў у той час за лыдку, то, мабыць, і паверыўбы яму на гоноровае дэпутацкае слова, што-ткі запраўды каталіцкаго заводу баларусоў німа. Але ушчыпнуўшыся схамянуўся я і прыпомніў, што я-ж сам каталік-беларус і мой брат і бацька і маці і бацькавы браты і матчыны браты і ўсе сваты сваццьці і іх дзеткі і ўнучкі, душ сотня прамігнула ў маей галаве—такі беларусоў каталікоў—і я запярэчыў яму, але прызнаюся, давясьці не патрапіў, што я беларус. Нават і тое не памагло, калі я прызнаўся, што прозвішчэ маё, усяго толькі 40 гадоў пішэцца Головінскі, с таго часу, як мой бацька разбагацеў на арэндзі і прыпісаўся у мешчанства, а перш маё прозвішчэ пісалося проста Голаўня. Налічыў гэткіх перамен у прозвішчах сваіх больш дзесятка знаёмых і сваякоў. Не памагло. Разсталіся казыручыся адзін на другога.

На душы было сумна. Убачыў я быўшаго свайго сябры і калегі, па пастушскай прафэсіі, цяпер пісара у нотаруса чэлавека «с палітыкай» у мазгах;-звертаюся да яго і кажу-так і так, братка, крыўдзяць нас.— Што такое? — Я расказаў яму усё. Абурыўся мой прыяцель за нахабства сівога ягомасьця. Абазваў яго палітычным круцялём, недавучкам і інш. І кажэ мне, само сабой, як эдукаваны чэлавек (скончыў слаўную ў Д. воласьці цэркоўна прыходзкую школу, павідаў ні мала сьвету атбываючы ваенную службу у Коўні) па расійску; мы народ рускі, вера у нас „Руская“ і «язык то» „рускі“ і еслі і есть *какіе* белоруссы, то только *с мужыкоу полякоу*“.

Соромна мне зрабілося за свайго сябру, с першым калі гаварылося то кіпела кроў і хоць відаць было што ён ў жывые вочы круціць, але ведае чаму і на што,—гэты-ж нешчасьлівы, і цёмны чэлавек, вызываў жаль і спачуцьце толькі, бо ён ў беднаце свайго засушэнаго розуму паўтараў, як но вабранец за федфебелем словы, каторых ні сэнсу, ні мэты ня ведае.

*Марцін Головінскі.*

---

## Купальле у Вільні.

У купальскую ноч 23-го чэрвеня увесь горад, ведаючы пра штогодняе сьвяткаваньне беларусоў у Вільні, высыпў на берэг Віліі паглядзець дзіўную казку на яву. І праўда, дзякуючы стараньню Беларускаго Муз.-Драм. Кружка, гэтае вялікае сьвята зелені і агня што год пякнеіць ды пякнеіць...

Вачам ня верылося—здавалося, што гэта нейкая цудоўная мара...

Уся Вілія ад Антокаля да Закрэтнаго лесу была у агнях... Парацэ, акружэнай з абодвых берагоў дзесяткамі тысяч людзей, плылі параходы, баркі і лодкі прыбраные зеленьню, сьветачамі і рознакалёрнымі ліхтарэнькамі. Над імі ўзвіваліся ў гару іскраукі (фаервэркі), іскрыліся бэнгальскіе агні. Мэлёдзіі музыкі і беларускаго хору ўторыла шчырым віншаваньнем публіка з берагоў.

Прыехаўшы у Закретны лес гулялі тамака ўсю ноч, ешчэ захапіўшы ладны кавалак раніцы.

Там зноў былі вогнішчы, музыка, беларускі хор, беларускіе танцы, беларускіе гульні і інш.

Вельмі пекна выступалі беларускіе дзявочые уборы.

Словам, пазіраючы на гэту містэрію поўную харaства і паэзіі душа безгранічна весялілася... Агульны шчыры настрой абхапіў грамаду людзей каторые забыўшы свае штодзенные клапоты увайшлі хоць на кароткі час ва ўладарнасць праўдзіваго шчыраго паэтычнаго настрою

*З. Б.*

---

## Не шукай...

Не шукай ты шчасьця, долі
На чужым, далёкім полі,
Гэт, за шумным лесам-борам,
За шырокім, сінім морэм
Не шукай ты шчасьця, долі.
Ты ўсё знайдзэш гэта блізка
Там, дзэ маці над калыскай
Табе песьні напевала,
Як малога калыхала,
Толькі ўмей шукаці блізка.

* * *

Не шукай сабе дружакаў
Між чужынцаў, між піякаў,
Ні у месьці, ні ў палацы,
Ні пры лёгкай панскай працы,—
Не шукай ты там дружакаў.
Ты іх знайдзеш вельмі блізка,
Каля хаты, каля нізкай,
Дзе ганяў жывёлу з малку,
Дзе касой махаў на разку,
Толькі ўмей шукаці блізка.

* * *

---

Магда так павольна варушылася, як бы і ня думала ісьці да дому. Часамі выходзіла яна ў сенцы ды зараз жэ ізноў паказывалася ў хаці. А Іван, чуць толькі яна выйдзе, торопна угляdaўся і прыслухаўся, як далёка адышлася. Магда, каб застагнаць хоць адзін разок, і ніяк не ўдавалося.

— Божэ мой! што яна робіць са мною? Скарэй-бы пайшла ўжо адгэтуль не цярпелося Івану.

— Ну, Іванка, бывай здаровы...

Іван узрадаваўся на момэнт, ды зараз жэ ешчэ горш апаў духам, як Магда скончыла гаварыць:

— Ідзе сюды мама.

Сказаўшы гэта, Магда борздзенька пацалавала ешчэ раз Івана, прыгнула галаву і ціхачом шмыгнула за парог, на задворкі, каб не спатыкацца з маткай, і пашла да дому.

— Эй, малады, малады! брыдка! Праз тры дні вясельля, а ён расцягнуўся, як навой! — громка, на ўсю хату, забарабаніла Настуля, Магдзіна маці.

— Што у цябе баліць, Іванка?

— Нічога,—буркнуў сярдзіта Іван.

— Дык чаго-ж ляжыш?

— А што-ж мне рабіць? скакаць?

— На вясельлі скачы, а цяпер ачунівай. Пакажы, сынок, свой лоб.—Іван злосна заварушыўся, лёг на сьпіну і выставіў лоб.

Старая Наста прылажыла руку на лоб, потым збоку, потым з другога.

— Трохі ёсць агонь, але нічагутка, глупства. Гэта табе з ветру пашкодзіла. От я зараз напару ліповаго цьвету с чаборыкам, вып'еш, прапацееш і пройдзе.

— Я і так ужо пацею,—адазваўся хворы.

— Ну, гэтаго мала: трэба, каб спацеў ад зёлак,—стаяла на сваём Наста.

Бачыць Іван, што тут нічога ня зробіш.

— Нічога мне ня трэба. Дайце мне палежаць спакойна, і ўсё пройдзе.

— Хто-ж табе ні дае лежаць? ляжы сабе, а лекарства я табе ўсё-ж такі дам.

—Ведаеця што,—пусьціўся Іванка ў хітрыкі:—мне так заманулося гарэлкі, што здаецца, каб выпіў чарачку, то зразу ачуняў бы. Каб як сказаць Магдзі, ніхай бы прынесла мне кручок.

— Гарэлкі зажадалося, кажэш?

— Ой, як хочэцца!

— Ну, то яна на пэўна паможэ. Калі хворы чэлавек моцна хочэ чаго, то тое памагае. Я помню, мой Андрэй хварэў на Тыфус. Стаў крыху ачуніваць. Зажадалося яму хлеба, як табе, от гарэлкі. А дактары—Божэ барані есьці чорны хлеб. Я мусіла хаваць ад яго хлеб, хоць ён і стары, мой Андрэй, але хворы горш малога. Раз ён устаў ціхэнька ў ночы, зайшоў ў камору і чуць што ня цэлы бохан вытрубіў і што-ж ты думаеш? Як бачыш ачуняў... Ну, я пайду.

Счэкаўшы крыху, Іван падняўся, падышоў да вакна—нікога німа. Тагды Іван паваліўся на пасьцель, накрыўся коўдраю, потым нагамі сьцягнуў яе с сябе, схапіўся за бакі.

— Ой! ой! ой! о-е-ё-ё-й!—заойкаў, застагнаў Іван і сам ня верыў гэтаму шчасьцю. Стагнаў ён доўга, стагнаў на ўсе лады і галасы: то высока і тонка, то нізка і тоўста, то каротка, адрывіста, то працяжна і пявуча; пры гэтым ён варочаўся, корчыўся так, што зубамі мог дастаць свае калені, то выцягаўся, колькі дазвалялі яму скура, жылы і косьці.

А як перэстагнаў ўсё, то пачаў высьпевываць свае стогны на манер песьні „Сонцэ ўсходзіць і заходзіць“.

— О-о-е-ёй! о ё й! о е-ё-й—да!

— Вот табе і хворы: ляжыць сабе ды сьпевае,—сказаля Настуля, перэступіўшы з Магдай парог хаты. У хвартуху у яе быў гарачы імбрычэк з зёлкамі і паўкварты гарэлкі.

— Выстагнаўся, дык і паправіўся,—сказаў, усьміхаючыся, Іван.

*Тарас Гушча.*

---

# ЭТАПНЫ.

Сонцэ заходзіло за лес. Цёплы майскі вечэр абыймаў зямлю; густая раса клалася на траву і на дрэвы. С поля ехалі гаспадарэ. Скрозь было вясёла і радасна. Маладая ярына, некольки тыднёў таму як пасеяная, распушчала шырока свае маладые лісткі. Далёка, на гасцінцы відаць было трое людзей: яны йшлі. Во, яны падходзяць да сваей мэты—воласці. Двое з іх павінны вярнуцца назад, а трэцьці застацца. Хто-ж гэты трэцьці?. Гэта Янусь Бугай, яго гоняць па этапу дамоў. Скора канец яго дарозі, скора і родная вёска, поле, лес, сенажаць... Падыйшлі к воласці.

Вечар добры!—загаманіў старэйшы дзесяцкі, да сідзячаго на ганку пісара,

— Вечэр добры!—атказаў той:—Што.. госця зноў прывялі?

— Але, прывялі, хай паначуе—сказаў другі дзесяцкі.

— Зашто папаўся?—спытаў пісар Бугая.— Той патупіў вочы:

— За кражу, дый пашпарту срок кончыўся.

— Ну, дык пакармі. брат, нашых клапоў сягоньня, а заўтра раніцой мы цябе атправім далей.

— Бумагі дзе?

— А, во, тут—сказаў дзесяцкі падаючы паперы.

— А вы распісаліся?

— Ды не.

— Ну дык ідзіця распішыцеся!

Дзесяцкіе пайшлі у воласць.

— Ну чаго... Сядой... Заўтра будзіш дома? Звярнуўся пісар да Бугая.

— Дзякую—атказаў той.

— Ведаеш, я цябе ўжо не пасаджу у халодніцу, бо тама і так поўна гэткіх малайцоў. Спаць будзеш разам са старажамі у адрывцы.

Бугай маўчаў, відаць было, што ён хацеў падзякаваць, але нямог падабраць слова.

— А ты-ж не уцячэш?

У гэту пару вышлі дзесяцкіе.

— Добранач, паночку!

Не шукай сабе, мой братку,
З ветрам бацькаўшчыну-матку
Ні на сушы, ні на моры,
Ні у шчасьці, ні у горы,
Не шукай яе там, братку
Яе знайдзеш вельмі блізка,
Як знаходзе лес вятрыска,
Толькі ў сэрца глянь сваё ты,
І ў душу заглянь з ахвотай,—
Знайдзеш бацькаўшчыну блізка.

*Янка Купала.*

Акопы 21/VI—13 г.

## Купідон.

Ад споміноў дзіцячых лет
У маёй душы астаўся сьлед.
Я помню, як бывала рада
Маё сэрцэ плітцы шакалада
Абгорненай з усіх старон
Паперкай яркай з візэрункам:
Там пад «загадачным малюнкам»
Пытаньне йшло: «Дзе Купідон?»
Я не забыў, як доўга з ей
Сядзеў я ў коўнатцы маей,
Страх зацікаўлены загадкай,
Хоць закусіўшы шакаладкай.
Бо тут жэ, тут хаваўся ты!
Бо можэ с сетак малявідла,
Што ўжо даўно вачам абрыдла,
Твае праглянуць мне чэрты,
І ўстанеш ты пярэдамной
С крылатай, гостраю стралой
Мне ў сэрцэ мецячай, і з лукам
Пеяць гатовым поўным згукам!

Ды ўсё жэ быў не бачэн ён,
Хоць я і сьлезы ліць прыймаўся.
Што-ж ты вачам не паказаўся,
Уладар каханьня, Купідон?

С тых часоў многа лет прайшло,
Прайшло—і зельлем парасло,
І зноў забытае пытаньне
Устае ў сувораму чэканьні.
Я Купідона зноў шукаць.
Бяруся скваппа і рухава,
Ды так не складна гэта справа,
Што лепш аб ей маўчаць.

*Максім Богдановіч.*

## Аб усім па троху.

### Аб манаполіі.

Кажуць, што тые асобы, каторые падалі праект завясьці гарэлачную манаполію думалі, што ад гэтаго зменшыцца пьянства, але манапольнае ведамства так павяло „добра“ сваю работу, так шчыра пастаралося расшырыць круг пакупцоў на свой тавар, што зменшаўшаеся перш, перад заведзеньнем гарэлачнай манаполіі, пьянства ізноў пачало расьці з году на год.

Гэта дужа добра паказываюць цыфры:

| да манаполіі. На душу выпівалі гарэлкі. Гады. | | пры манаполіі. На душу выпівалі гарэлкі. Гады. | |
|---|---|---|---|
| 1884 | 0,66 | 1902 | 0,49 |
| 1885 | 0,61 | 1903 | 0,52 |
| 1886 | 0,53 | 1904 | 0,51 |
| 1887 | 0,58 | 1905 | 0,53 |
| 1888 | 0,58 | 1906 | 0,60 |
| 1889 | 0,57 | 1907 | 0,59 |
| 1890 | 0,53 | 1908 | 0,57 |
| 1891 | 0,49 | 1909 | 0,55 |
| 1892 | 0,49 | 1910 | 0,56 |
| 1983 | 0,49 | 1611 | 0,61 |

Адным словам гарэлачная манаполія пашырыла вядзецца у нас добра, але затое яналіш не дорага абходзіцца народу: апрача грошы траціць ён на гэту „гаспадарку“ свае сілы, сваё здароўе, атуманівае свой розум.

### Фальшывая „казка“.

Шырока вядомы ў сваім часе, паважны расейскі пісьменнік, каторы, як кажуць, мае вялікую пашану у дужа высокіх кругах, князь Мешчэрскій, пішэ у «Гражданіне», што расейцы саўсім не прыналежаць да славянскай сямьі, ні духам, ні родам:

«Хто мы—ня ведаю, ведаю толькі, што мы не славяне»,—кажэ кн. Мешчэрскій і лічыць, што «што найбольшы вораг расеі ня немцы, ні англічане, ні кітайцы і не японцы, але вера у гэты фальш, што расейцы гэта славяне ды палітыка апертая на гэтай басьні».

Дужа многа праўды у славах ягомасьця Мешчэрскаго і яго можна павіншаваць за шчырасьць.

### Сельска-гаспадарская калонія.

Каля станціі Барібіно, Раз. Ур. зял. дар., вучоный аграном Крэмянскій залажыў хаўрусную сельска-гаспадарскую калонію. Куплена 70 дзесяцін зямлі за 16,000 руб. з разсрочкай платы па 1000 руб у год.

У хутары ёсць сад, ставок, паравы млын.

Працуюць усе супольнікі, хто больш працуе, таму больш і даюць. Усякая праца, як кабеты, так і мужчыны роўнацэнная. Наймітоў саўсім німа: усе работы павінны быць зроблены хаўрусьнікамі. Пакуль што працуюць пяць мужчын і адна кабета.

### „Національные“ справы.

Даўно ведама, што націоналісты вырасьлі с кішэні ягомасці Балашова. Гэта самы багаты і самы нямудры памешчык у Рассі, каторы,—як пішуць расейскіе газэты,—скупіў па агульніцкіх цэнах, усіх льсціўцоў, прахадзімцоў, дармаедоў і зрабіў з іх палітычную «партію».

Зрабіў, ведама, для сваей пацехі і сваей карьеры, бо дармаеды узяліся зрабіць ягомасьця Балашова міністрам.

Але цяпер справы націоналістоў надта кепскіе. У Пецярбурзе поўны развал національнаго клуба. Як мышы, уцекаюць націоналісты, с тонучаго карабля. Бягуць і па дарозі пішчаць. Нехта растраціў грошы. Ніхто не заплаціў даўгоў. Німа атчоту. У грашавых справах ніякаго парадку. Крык Гоман.

І ўсё:

— Грошы, грошы, грошы...

Грашамі гэта мёртвае справа пачалося, грашамі і канчаецца.

У грашах увесь сэнс „націоналізма“. Пачатак і канец яго. Нічога апрача грошы.

Калі чытаем аб кіпучай працы «націоналістоў»: „стараліся субсыдій“, «прасілі пазычыць», „вымагалі за службу», «растрацілі», „не здалі атчоту“, «не заплаіцлі доўгу»—перэд вачамі устае чэлавек с таўстым брухам і грамаднай ляпай склыкамі. Ні ў душы, ні ў твары ніякаго пачуцья і добра дзецелі, апрача пражорлівасьці, німа.

## З Беларусы і Літвы.

## Вільня.

### Ашунанцы.

З вясны праз вёскі Байканы, Медзяны і др. Палянскай воласці, Ашмянскага павету праходзілі два браты «Голіковы», каторые выдавалі сябе за агентоў нейкіх сельска-гаспадарскіх фірм і бралі задаткі ат селян на дастаўку землеробных машын. Задатку бралі па два рублі. Бяручы ат селян задатак выдавалі квіткі і паказывалі свае пашпорты.

Машын чэкалі ад вясны да Петра і нарэшці стpацілі надзею.

А браты „Голікавы“ тымчасам голюць дзе толькі можна, і ня думаюць аб тым, што можэ і нарвуцца на такіх каторые не паверуць ім і пакажуць мейсцо у «татавай» хаці.

*Галубок.*

## Мінск.

### Чэкаюць беларускаго тэатру.

У нашым мястэчку Раманове, Мінск. губ. Слуцк. пав. коштам мейсцовых грамадзян будуюць будынак на тэатр, сярэдняй велічыні. Работы вядуцца хатнім спосабам.

Да палавіны ліпня гэты тэатр, бадай што, будзе гатоў і ўжо можна будзе ставіць у ім сцэны. На мейсцы у Раманове труппы артыстоў німа, дык тутэйшые грамадзяне маняцца запрасіць сюды беларускую якую труппу.

*А. М.*

## Могілеу.

### Навіны з Горэк Могіл. губ.

— Надоячы на казённым заводзі машына адрэзала маладому хлопцу руку. Залетась туж-жэ пакалечыло вучня-практыканта. Ен доўга судзіўся з заводзкай адміністраціей, нічога ня высудзіў і ходзіць бязрукі.

У 20 дзен мая атруціўся ціаністым каліем вучэнік апошняе клясы земаямерна-аграноміцкаго вучылі-

---

— А ці ўсё акуратна зрабілі і ў кнігу запісалі?

— Усё як мае быць зроблена, ці мы першы раз гэта?

— Ну дык ідзіця.

Бугай сядзеў на ганку; на супроціў яго сядзеў пісар. Доўга яны маўчалі, пісар падпеваў сабе нешта пад нос. Яму хацелося разгаварыцца с кім небудзь.

— А здалёк—жэ цябе гонюць?

— З Адэсы.

— Здарава... А за што ж папаўся.

— За што папаўся...—паўтарыў Бугай і апусьціў вочы;—Гэта і сказаць сорамна, але ўсё ж роўна людзі ведаюць...

— Дык чаго-ж ты саромяешся?

— Я не саромяюся... Але...

— Ну дык раскажы...

— Гэта было вось як: Здакучыло мне жыць на роднай зямліцы і ўсё нейкай траспы хацелося... А чуў я, што у горадзі лёгка хлеб зарабляць: лягчэй, як на зямлі, думаў я што тама дарма грошы даюць і што скора там панам зраблюся, але выйшло іначэй...

— Што-ж там у цябе выйшло?—перабіў яго пісар павесялеўшым тонам.

— А вышло вось што: пазычыў я гэта у мястэчку у Рыбалтоўскаго грошы пад працэнты, ды перш думаў у Амэрыку, але жонка, дай ей Бог здароўе не пусьціла.

— Дык ты жэнаты?

Але, жэнаты.

А колькі ж табе было гадоў як ты жавіўся?

— Гадоў восемнадцаць, ці дзевятнадцаць. У бацькі я быў адзін дык...

— Дык ён цябе скарэй ажаніў.

— Але.

— Каб за дзеўчатаме ня богіў?

— Хто яго ведае чаму.

— А дзеці-ж у цябе ёсць?

— Было адно, ды памёрла. А цяпер мяне дома не было, ня ведаю... Жонка аба мне нічога ня ведае, а я аб ей.

— Вось будзе рада, як убачыць цябе.

— Або рада, або не...

— Ну, дык кажы за што цябе гоняць?

— Ну, вось, паехаў я за пазычэные грошы у Адэсу. Знайшоў там скора работу: на табачпай фабрыцы, дзе табаку робяць; там яе мешаюць, сушуць, труць. Застаўся я там. Чаго хочэш—сорак рублёў у месяц браў, але ня ўмеў жыць, перш. паслаў грошы жонцы, каб доўг атдала; выплаціўшы доўгсправіў адзене, пасылаў жонцы. Гэтак жыў я цэлы год, пакуль ня знюхаўся с тварышамі, каторые і давялі мяне вось да чаго.

Тут ён запнуўся.

Да чаго-ж цябе давялі таварышы?—запытаўся пісар.

— А да таго, што вось да хаты этапам гонюць, як басяка...

— Дык ты-ж басяк.

— Але, басяк, але хто вінен у гэтым?

— Хто вінен?—Гэта ўжо ты павінен ведаць.

— Чамуж, ведаю. Праўду людзі кажуць: „Не ганяйся за лёгкім хлебам, бо ніякаго ня будзеш мецьʺ Вось і я пагнаўся на лёгкае. і што выйшла? А ўсё гарэлка, каб на яе звод.»

— Чамуж хіба ты піў?»

— А якжэ ж... бывала збярэцца нас кумпанія дзе—небудзь у піўной, а ў Адэсі іх шмат... ну тама і давай піць... пьём, пьём... а там... а там... аж сорам успамінаць!

— Што-ж там?

— А там часамі давай біцца на нажы, адзін з другімі А тут паліцыя ды ў вучастак... а там пратакол, ды суд... гэтак і дажыліся да басяцтва. А ўсё роспуст робіць... Ня трэба было піць... А то з гэтаго пьянства і жонку кінуў... Праз гарэлку сумленьне страціў... пачаў красьці. Ведама, ня было-б с чаго жыць... Трэба ж кручок выпіць... каб ён згарэў.. Не, лепей было-б сядзець дома, ні ганяцца за панамі, а пілінавацца свайго мужыцкаго. Не жаліцца на свае крывавые мазалі, бо з іх бяды німа.

Што працавітаму чэлавеку? Ен папрацуе, пагаруе, але прыйдзе тая часіна, што ён і спачыне. Яму нішто ні баліць, яго нішто ня душыць. Ен ведае...

— Чамуж ты гэтаго ня пілінаваўся? запытаў здзіўлены пісар.

Ен мусі першы раз спаткаў гэткаго чэлавека. Яму так здавалося. Але ня першы і не апошні: шмат ёсць такіх людзей, але німа каму іх выслужаць; німа каму уцешыць.

— Не ўцекай ад бацькавай сермягі, ды не кладзі чорнай панскай адзежы, бо яна спарыць табе цела—зноў зачаў Бугай, перабіваючы пісара.— Лепш мужыцкай працы німа нічога і смачней чорнаго хлеба с соляй німаш яды!

— А тыж еў сягоньня што-небудзь?

— Рана памагаў у Ж...кай воласьці старажам падлогі мыць у пісаравай хаці, бо тама вясельле будзе здаецца... пісар дачку атдае ці што... а паненка такая харошая с твару... сражнік, ці хто яе бярэ, дык тама далі пасьнедаць, а ў Жыткавічах папрасіў у аднэй кабеты, дык дала папалуднаваць...—Ну а цяпер пайдзі на кухню, ды скажы маей кухарцы, дык яна табе дасьць павячэраць... Але пачэкай... Вось і яна сама тутака... Марыля, што скажэш?

— Панічу тама с хваліварку прывязлі мукі, парася...

— Дык чаго ж ты, прыймі, ведаеш як... ды дай гэтаму чэлавеку павячэраць,—А ты ідзі за ею—звярнуўся да Бугая—а там пойдзеш спаць у адрыну са старажамі,

— Дзякуй, панічок, табе за ўсе ніхай...

— Ну, ну даволі...

Бугай выйшоў за Марыляй...

Пісар доўга сядзеў парушэны расказамі Бугая і думаў аб сваіх бацьках і братох, што гэтак сама працуюць над зямлёю на Беларусі.

Яму стала сорамна за сябе перад імі. Думкі самі лезлі у галаву. Ужо добра пахаладзело, месяц ўсплыў на сярэдзіну неба а ён ня йшоў спаць. Недзе далёка сьпеваў салавей... «Беларусь!—ускрыкнуў пісар, як укушэны—„як ты дзіўна часамі!.. Я гэтаго дагэтуль ні бачыў... Твае хаты, палі, горкі, рэчкі... Беларусь!.. ці ня ты мая маці?.. Чаму я ня любіў цябе наўперш?.. Падходзьце, добрые людзі я вас усіх расцалую: сягоньня атчыніўся перада мной новы свет... Новы сьвет, новаго роднаго жыцья!

Доўга ён так ешчэ брадзіў мысьлямі...

Ужо пачало развідняцца, як ён пашоў спаць.

*Юшко.*

